Ванда БАРОЎКА,
доктар філалагічных навук

# АКСІЯЛАГІЧНЫ ДЫЯПАЗОН ПРОЗЫ ПЛАТОНА ГАЛАВАЧА



120

Платон Раманавіч Галавач [18 красавіка (1 мая) 1903 г., в. Пабокавічы Бабруйскага павета – 29 кастрычніка 1937 г., Мінск] – пісьменнік, чый талент не паспеў разгарнуцца на поўную сілу з пазалітаратурных прычынаў. Ён нарадзіўся ў сялянскай сям'і на Бабруйшчыне, у час белапольскай акупацыі стаў падпольшчыкам, пасля вызвалення Беларусі быў спачатку байцом, потым камандзірам атрада надзвычайнага прызначэння. З верасня 1920 г. Галавач уступіў у камсамол, прайшоў шлях ад сакратара вясковай камсамольскай ячэйкі да першага сакратара ЦК ЛКСМБ, па іроніі лёсу быў расстраляны на падставе сфабрыкаванага абвінавачвання ў "прыналежнасці да контррэвалюцыйнай трацкісцка-тэрарыстычнай арганізацыі" ў дзень нараджэння ВЛКСМ.

Аксіялагічныя ўстаноўкі, мастацкія прынцыпы П. Галавача галоўным чынам сфарміраваліся пад уплывам грамадскай дзейнасці і сацыяльна-культурнай атмасферы часу. Ён зыходзіў з перакanання, што пісьменнік абавязаны канцэнтравацца на сацыяльна значным, а творчасць павінна быць дзейснай. Як сведчаць яго артыкулы 1929 г. з характэрнымі для той пары назвамі "Сарваць маску!", "Пра ваяўнічае мяшчанства ў літаратуры, пра рыцараў пад маскамі і антысавецкія выступленні некаторых яго сынкоў, а таксама пра раз'юшаны нацыянал-дэмакратызм", П. Галавач не прымаў сацыяльнай індыферэнтнасці з боку мастакоў слова, прыстасавальніцтва, фармалістычных эксперыментаў, камерных тэм. У "Аўтабіяграфіі" 1935 г. пра сябе зазначаў, што вучыўся пісаць на ўсім найлепшым, асабліва на творах М. Горкага.

У 1930-я гг. П. Галавач у духу часу абвяшчаў стымулам развіцця літаратуры ачышчэнне ад класава і ідэйна варожых элементаў, але разам з тым спрабаваў абараніць ад несправядлівых нападак, як сведчаць яго лісты, Кузьму Чорнага, Сымона Баранавых, Уладзіміра Хадыку. П. Галавач лічыў літаратуру сацыяльна ангажаванай з'явай, але адкідаў кан'юнктурнасць. У прыватнасці, у артыкуле "Ці патрэбна нам навела?" 1936 г. аргументавана даказваў, што ацэнка твора *"з пункту гледжання толькі вартасці тэмы прыводзіць да паяўлення апавяданняў, якія не ствараюцца мастакамі, а робяцца рамеснікамі, у якіх усё разлічана і ўлічана, пачынаючы ад суб'ектыўных мастацкіх густаў рэдактара"* [1, с. 386]. Кола творчых інтарэсаў пісьменніка было шырокім: хоць ён паказваў галоўным чынам імклівую сучаснасць у яе характэрных сацыяльных адзнаках (дзейнасць жансаветаў, пралетарызацыя адукацыі, станаўленне камсамольскіх ячэек, партыйныя і камсамольскія чысткі, нараджэнне новай сістэмы каштоўнасцей, калектывізацыя сельскай гаспадаркі і г. д.), але збіраў матэрыялы для раманаў пра Кастуся Каліноўскага і паўстанне 1863 г., пра адносна нядаўняе мінулае ("Вялікі Дняпро" і "Дарога ў свет"), падрыхтаваў чарнавы варыянт рамана пра пісьменнікаў "Ён".

Літаратурны дэбют П. Галавача – апавяданне "Загубленае жыццё", напісанае паводле пачутай на Мсціслаўшчыне гісторыі і надрукаванае на старонках "Савецкай Беларусі" (1925). У аснове твора сюжэт пра падманутую дзяўчыну. Прыгажуня Ніна Шапілёва пайшла ў горад на заробкі, нанялася служыць да былога памешчыка Галіноўскага, сын якога спакусіў і падмануў Ніну. Нямоглую дзяўчыну Галіноўскія прагналі са службы, а бацька – з роднай хаты. Абаронцай Ніны стала толькі жанарганізатар Паша, якая хацела наладзіць паказальны суд над Лявонам Галіноўскім, аднак фізічна і духоўна надломленая Ніна атруцілася. Першае апавяданне было апісальным і меладраматычным, рыхлым па кампазіцыі, але падкупляла вострай пастаноўкай этычных пытанняў. Ужо ў "Загубленым жыцці" абазначыўся адзін з цэнтральных матываў творчасці пісьменніка: мара чалавека пра лепшае жыццё. Пра маладосць, няспраўджаныя надзеі на

шчасце расказвалася ў раннім апавяданні "Абмылілася". Гераіня твора гараджанка Ліда "*сядзела ў багне мяшчанства*", аднак вельмі хацела "*маленькім раўчуком уліцца ў рэчку вялікага жыцця*" [2, с. 120]. Дзяўчына закахалася ў рабочага Капцюра, памылкова прыняўшы яго за новага чалавека, расчараванне давяло Ліду да самагубства. Дэтэрмінацыя заганных рыс чалавечага характару ў ранніх творах пісьменнікам сацыялагічна спрашчалася: Лявон Галіноўскі падманвае Ніну, таму што ён памешчыцкі сын ("Загубленае жыццё"), нягоднік Капцюр ("Абмылілася") – былы белы афіцэр; прыстасавальніцтва, спажывецкая псіхалогія і маральная сапсаванасць загадчыка аддзела важнай савецкай установы Сямёна Пахомавіча Адзінкі ("Бывае й так") тлумачацца яго нэпманствам у нядаўнім мінулым.

Апавяданне – дамінантны жанр у прозе П. Галавача. Гэта засведчылі зборнікі "Дробязі жыцця" (1927), "Хочацца жыць" (1930), "Апавяданні" (1934). Пасля знаёмства з імі Янка Брыль у 1957 г. назваў П. Галавача "цікавым, так дзіка і незаслужана выкінутым калісьці з жыцця і з літаратуры чалавекам і пісьменнікам" [3, с. 188]. Проза П. Галавача на канцэптуальным узроўні несла моцны адбітак гістарычнага часу. Тэматыка яго апавяданняў – сацыяльныя і духоўныя змены ў соцыуме, што раскрываліся галоўным чынам праз побытавы план. Максім Гарэцкі слушна заўважыў, што "сюжэты свае найчасцей бярэ Платон Галавач з блізкага яму ад маладых дзён вясковага жыцця, часам малюе гарадское, пазней ім пазнавае, жыццё" [4, с. 387]. Пісьменніка цікавілі перамены ў свядомасці і быце гараджан і вяскоўцаў. Сур'ёзнай праблемай для сялянства 1920-х гг. было землеўпарадкаванне. У "Рубанаўскім вузле", для прыкладу, падавалася своеасаблівая хроніка перадзелаў зямлі ў адной вёсцы, якія справядліва завяршыліся толькі пасля рэвалюцыі дзякуючы настойлівасці новага старшыні валвыканкама. Зместам твора даводзілася, што сумленнае вырашэнне зямельнага пытання на месцах спрыяе росту даверу да ўлады, што на адказных пасадах павінны працаваць энергічныя людзі. У творах "Абмылілася", "Яўленая", "Суседзі" артыкулявалася думка, што жыццёвыя дробязі часта высвечваюць самыя істотныя моманты жыцця. Хоць і не такое вялікае месца, як у рускай, у беларускай прозе 1920-х гг. пэўнае месца займала тэма размежавання паміж роднымі людзьмі ў час грамадзянскай вайны (варта прыгадаць раман "Сястра" К. Чорнага, апавяданне "Маці" Янкі Нёманскага). Яна раскрывалася П. Галавачом праз сутыкненне антынамічных маральных імператываў персанажаў. У "Дзвюх сцежках", напрыклад, багаты купец Рудзін і яго сын Андрэй становяцца ворагамі не толькі з-за рознасці сацыяльных сімпатый і ідэйных перакананняў, але і па прычынах этычнага парадку: сын ненавідзіць падман, ён не прывык крыўдзіць слабейшых, як гэта робіць яго бацька.

Героямі апавяданняў пісьменніка найперш станавіліся людзі, якія імкнуліся да новага, маладыя ўзростам або маладыя душой, чыя жыццёвая праграма магла стаць узорам, вартым пераймання. Салдат Першай сусветнай вайны Сузон у замалёўцы "Не так" пасля наведвання дома разумее неабходнасць перамен, але ўсведамляе немагчымасць здзейсніць іх аднаму. Дапытлівая і мэтанакіраваная Надзя ў апавяданні "Дасужая" прагне праз адукацыю выйсці за вузкае кола звыклай вясковай паўсядзённасці. Гэта дзяўчына з кагорты Купалавых "*арлянят*". Па дарозе на вучобу яе вусны «*са стукам сэрца шапталі такія зразумелыя зараз словы: "Гэй, наперад, покі сэрца б'ецца, рвецца на прастор! Гэй, да сонца, гэй, да зор!" І перад вачамі яскрава ўсплывалі прасторы недалёкай будучыні, асветленай сонцам навукі, цудоўныя далёкія зоры*» [1, с. 176]. Надзя ўпэўнена, што перад яе равеснікамі адкрыта шырокая дарога для шчасця: "*Толькі цяпер можна жыць па-сапраўднаму, у поўным сэнсе гэтага слова – жыць, можна зрабіць да краёў поўным сваё жыццё, зрабіць яго прыгожым*" [1, с. 201]. Рамантычная акрыленасць у характары Надзі спалучаецца з мэтанакіраваным ажыццяўленнем задуманага. Грамадскае вышэй за асабістае, духоўнае вышэй за матэрыяльнае ставяць маладыя людзі ў творы "Даляры". У значнай ступені дэкларацыйны вобраз героя новага часу, які верыць у светлую будучыню чалавецтва, на першае месца ставіць грамадскія інтарэсы, пададзены ў апавяданні "Перад канцом". Рабочы Пятро Акуліч хворы на сэрца і ведае, што хутка памрэ, аднак уласная смерць не засмучае яго, ён радуецца, што яго месца зоймуць лепшыя і разумнейшыя за яго людзі. Пытанні жыцця і смерці, сэнсу жыцця маладым пісьменнікам вырашаліся дастаткова рытарычна, мастацкія вартасці апавядання зніжаліся адкрытай дыдактычнасцю вобраза Акуліча. Галавач адлюстраваў і працэс змены маральных ды матэрыяльных каштоўнасцей, які спараджаў нярэдка камічныя сітуацыі. Адну з іх пісьменнік узнавіў у апавяданні "Кнак", дзе блізкія людзі сварацца з-за назапашаных старых грошай, што ў новых умовах страцілі вартасць.

Апісальнасць, расцягнутасць аповеду, дыдактычнасць у ранніх апавяданнях былі праявамі творчага росту, якія паступова пераадольваліся. На фоне маладнякоўскай прозы П. Галавач, па слушнай заўвазе М. Гарэцкага, адпачаткава "трымаўся здаровага рэалізму" [4, с. 389], не вылучаўся празмернай схільнасцю да метафарычнага стылю, звяртаў увагу на складанасць чалавеча-

га характару, на паводзіны людзей у няпростых жыццёвых абставінах. Напрыклад, у апавяданні "Уцякач" ён паказаў чалавека, які па сваёй волі апынуўся ў безвыходным становішчы: чырвонаармеец Павел Голуб з-за страху смерці ўцякае з войска і чакае выканання прысуду вайскова-рэвалюцыйнага трыбунала. Пісьменнік пазбягае адкрытай ацэнкі ўчынку дэзерціра, але праз адлюстраванне думак і пачуццяў уцекача даводзіць, што неперааддолены страх губіць чалавека.

На пачатку 1930-х гг. у апавяданнях "Нястрымнае", "Свежы вецер", "Кара" П. Галавач звярнуўся да тэмы калектывізацыі. "Нястрымнае" – традыцыйны ў праблемна-тэматычным і сюжэтна-кампазіцыйным плане для таго часу твор, дзе аўтар праз псіхалагічна афарбаваныя дэталі паказвае пакуты і сумненні серадняка перад уступленнем у калгас. У "Свежым ветры" выкарыстаны арыгінальны сюжэтны ход: ацэнка калектывізацыі даецца беларусам Міколам Высоцкім, які жыве і працуе ў Амерыцы. З лістоў родных Мікола даведваецца пра раскулачванне бацькоўскай сям'і, пра выключэнне з тэхнікума яго брата. Высоцкі ў лісце да родных супакойвае іх тым, што ў перыяд знішчэння старога непазбежныя памылкі, іх некалі выправяць. Аптымізм Міколы, як аб'ектыўна вынікае з аповеду, заснаваны на цалкам станоўчым успрыманні таго, ад чаго ён далёкі ў прамым і пераносным сэнсах. З нестандартнага сюжэтнага ракурсу калектывізацыя разглядалася ў апавяданні "Кара", дзе праз падзейны рад падкрэслівалася, што, з аднаго боку, ёсць сілы, якія рознымі спосабамі процідзейнічаюць калектывізацыі, з другога боку – працэс калектывізацыі належным чынам не тлумачыцца тымі, хто абавязаны гэтым займацца. У першай палове 1930-х гг. у творчасці П. Галавача з'явілася тэма барацьбы заходніх беларусаў за ўз'яднанне. У "Навеле без назвы", "З тых дзён", "Спатканні" з выкарыстаннем фрагментарнай кампазіцыі і прыгодніцкіх элементаў акцэнтаваліся складаныя ўмовы змагання заходнебеларускіх падпольшчыкаў.

Платон Галавач пастаянна знаходзіўся ў віры грамадскага жыцця, займаў адказныя пасады [першы сакратар ЦК ЛКСМБ, намеснік наркама асветы, член ЦК КП(б)Б і ЦВК, адказны сакратар газеты "Чырвоная змена", рэдактар часопісаў "Маладняк" і "Полымя"]. Гэта давала яму багаты матэрыял для напісання не толькі апавяданняў, але і твораў больш вялікай формы. У 1929 г. з'явілася аповесць з інверсійнай кампазіцыяй "Вінаваты", дзе праблема даверу да чалавека была цэнтральнай. Студэнт тэхнікума Алесь Шавец паказаны ахвярай празмернай пільнасці і носьбітам новай маралі, дзе класавае важнейшае за крэўнае. Алеся абвінавачваюць ва ўтойванні мінулага бацькі, які пры царызме служыў у сакрэтнай канцылярыі. Ва ўмовах пралетарызацыі адукацыі маладзы Шавец з-за мінулага бацькі фармальна не меў права навучацца ў тэхнікуме. Сам Алесь вельмі патрабавальна адносіўся да людзей. На сходзе, дзе абмяркоўвалася ўтойванне студэнтам Міронавым сацыяльнага становішча, Алесь папракаў таварышаў: "*Я заўжды буду гаварыць, што мы занадта шкадуем усіх і ад гэтага не ўмеем адрозніць чужога, ворага*" [5, с. 245]. Бязлітаснасць у дачыненні да іншых прывяла да падобнага стаўлення многіх таварышаў да Алеся, якія, у адрозненне ад Міронава, насамрэч нічога не ведаў пра мінулае бацькі і з маладых гадоў быў шчырым прыхільнікам новай улады. Паказальна, што дванаццаццю галасамі супраць адзінаццаці Алеся выключаюць з тэхнікума і з партыі. Іншымі словамі, не ўсе таварышы Алеся паводзілі сябе на чыстках так, як гэта рабіў ён. Неспадзявана апынуўшыся сярод адрынутых, Алесь спрабаваў вярнуць сабе добрае імя, але сутыкнуўся з абыякавасцю знаёмага яму сталічнага чыноўніка Дзяніса Смачнага і старшыні апеляцыйнай камісіі Парамона Засланкі. Гісторыяй Алеся Шаўца П. Галавач папярэджваў пра шкоднасць фармальнага падыходу да чалавека, звяртаў увагу на неадназначнасць крытэрыяў, на якіх грунтавалася пралетарызацыя адукацыі. Аповесць стала свайго роду прарочым творам у лёсе аўтара: П. Галавач заклікаў да барацьбы з класава варожымі элементамі ў жыцці і ў беларускай літаратуры, а потым сам апынуўся ў ролі абвінавачанага.

Драматызм працэсаў, што адбываліся ў вёсцы ў канцы 1920 – пачатку 1930-х гг., пісьменнік адлюстраваў у аповесці з элементамі мантажнай кампазіцыі "Спалох на загонах". Эпіграфы да твора, узятыя з аповесці "Дзяцінства" М. Горкага ("Началась и потекла со страшной быстротой густая, пёстрая, невыразимо странная жизнь. Она вспоминается мне, как суровая сказка, хорошо рассказанная добрым, но мучительно правдивым гением") і верша "Сыходзіш, вёска, з яснай явы..." Я. Купалы ("З жабрацкай торбай твой патомак / Не пойдзе па сібірным шляху / Шукаць прытулку, як бяздомак. / Жудкі гісторыі абломак / Пад сказ дзён бурных згіне прахам") [5, с. 7], – адмысловая аўтарская ацэнка сітуацыі і аптымістычны прагноз будучыні суайчыннікаў. Сюжэт традыцыйны для літаратуры таго часу: рабочы-камуніст з горада прыязджае ў вёску Цярэшкаў Брод арганізоўваць калгас. Палітычна свядомыя рабочыя ў аповесці проціпастаўляюцца інертным сялянам. Рабочы Панас – вясковец па нараджэнні. Ён рана застаўся сіратой, бо бацька загінуў ад рукі роднага брата пры раздзеле маёмасці, таму Панас з маленства ненавідзіць прыватную ўласнасць. Вясковае жыццё малады рабочы параўноўваў з вадой у копанцы, якую неабходна ўскалыхнуць.

Панас бачыў, што калектывізацыю большасць сялян сустрэла з насцярожанасцю і страхам. На адным сходзе нават былы парабак заявіў, што не хоча быць у калектыве, бо ўжо прызвычаіўся працаваць на сябе, яго падтрымала і сівая жанчына: “*Дайце нам пажыць хоць некалькі год вольна, дайце паспрабаваць вольнага жыцця*” [5, с. 95]. Людзі баяліся перамен: “*...аддай усё сваё, а як жа сам тады? Ніхто нідзе не бачыў такога жыцця, дык як жа ён каторы пойдзе ў такое...*” [5, с. 145]. Вяскоўцаў палохалі і сілавыя метады працы з сялянамі, калі “*работнікі прыязджаюць у вёску ды чорт ведае, што робяць, абы ўцягнуць мужыка*” [5, с. 77].

Каб пераканаць вяскоўцаў у перавазе калектыўнай працы, Панас адпраўляе некалькі чалавек азнаёміцца з жыццём Навікоўскай камуны, арганізаванай на месцы былой памешчыцкай гаспадаркі. Пісьменнік сцвярджаў, што не адміністраванне, а перакананне павінна ляжаць у аснове агітацыі за калгасы, што важна не толькі стварыць калгас, але і прадумана наладзіць працу людзей. Арганізатарская стратэгія Панаса дала пэўны плён, людзі сталі падаваць заявы ў калгас. Як сумленны мастак слова П. Галавач выбраў для твора не аптымістычны фінал, Панас загінуў падчас завяршэння першага калектыўнага ворыва ад раз’юшанага жаночага натоўпу: “*Над зямлёю павольна ўздымалася і плыло ўгору, у бязмежны блакітны прастор, гарачае веснавое сонца. Пад сонцам у разорах на раллі стаялі запрэжаныя ў плугі коні, чакалі аратых*” [5, с. 164]. Такога кшталту заканчэнне твора, калі ў гарачую пару запрэжаныя коні чакаюць аратых, шматзначнае: Панас загінуў, невядома, хто і якім чынам будзе працягваць пачатую ім справу. П. Галавач не аспрэчваў неабходнасць калектывізацыі, ён падкрэсліваў складанасць гэтага працэсу, неправамернасць жорсткага адміністравання і ігнаравання асаблівасцей стагоддзямі сфарміраванай сялянскай псіхалогіі.

У 1934 г. выйшаў з друку раман са шматпланавай кампазіцыяй, з шырокім ахопам часу і прасторы, з элементамі празрыстай іншасказальнасці і публіцыстычнасці “Праз гады”. Рэцэнзент А. Гараўскі трапна назваў яго “раманам пра буйныя падзеі ў ценю пейзажаў і настрояў”. Дзеянне там адбываецца на працягу амаль дваццаці гадоў. Празаік узнавіў асноўныя моманты грамадскага жыцця 1910 – пачатку 1930-х гг.: рэвалюцыйны студэнцкі рух, сталыпінскую рэформу, Першую сусветную вайну, рэвалюцыю, салдацкія і сялянскія камітэты, грамадзянскую вайну, харчразвёрстку, камбеды, надзвычайныя аддзелы, перадзел зямлі, жанаддзелы, стварэнне камсамольскіх ячэек на вёсцы, індустрыялізацыю, калектывізацыю, культурную рэвалюцыю. Яны паказаны праз лёсы бальшавіка Паўла Будніка з выверaным класавым падыходам да людзей, прадстаўнікоў старой (прафесары Пілацееў і Галынскі) і новай (Кастусь Шкробат, Аксана Каляда) інтэлігенцыі, сялянскай сям’і Шкробатаў. Усе сюжэтныя лініі аб’ядноўвае вобраз Паўла Андрэевіча Будніка – валявога, энергічнага, дасведчанага партыйца-кіраўніка, які абраў сваёй мэтай змяненне свету да лепшага і застаецца верным ёй на працягу жыцця.

Вобраз Будніка адцяняецца вобразамі яго маладога аднадумцы Васіля Мілоўскага і антыподаў (студэнта-рэзанёра Кулікоўскага, прафесара-цемрашала Пілацеева і яго сына Адама, недалёкага партыйца Лёйкі). Эвалюцыя поглядаў старой інтэлігенцыі раскрываецца на прыкладзе змены светабачання прафесара Галынскага, які раней верыў у выратавальную сілу дэмакратыі, асуджаў гвалт, пасля пад уплывам сацыяльных змен знайшоў сваё месца ў сацыялістычным будаўніцтве і па-іншаму паставіўся да дэмакратычных ілюзій маладосці. У прыватнасці, калі адзін з яго знаёмых абураецца раскулачваннем, то Міхаіл Галынскі з пазіцый так званага “арыфметычнага гуманізму” (Я. Дабрэнка) яму заяўляе: “*Але калі заўтрашні дзень будзе для ўсіх больш сытым, больш шчаслівым і разумным, я схілен апраўдаць гэта*” [6, с. 360].

Лёсы сялянства асвятляліся найперш праз вобразы трох братоў Шкробатаў: багацея Мікіты і беднякоў Паўла і Тарэнты. Вобраз Мікіты ў рамане дастаткова схематычны, багацей Мікіта паказаны крывадушным чалавекам, прыхільнікам старых часоў і старой улады. Вобраз Тарэнты Шкробата жыццёва паўнакроўны і па-мастацку пераканаўчы. Тарэнта – адвечны працаўнік, які ў пошуках зямлі і долі адправіўся ў Сібір, ні з чым вярнуўся дадому, трапіў на фронт спачатку Першай сусветнай, а потым грамадзянскай вайны, там вырас палітычна, а ў 1920-я гг. дзякуючы працавітасці стаў заможным гаспадаром. Ён доўга і пакутліва вагаўся перад уступленнем у калгас, заяву напісаў пад пагрозай раскулачвання.

Пэўнае месца надавалася ў рамане асуджэнню кан’юнктурнасці ў літаратуры і журналістыцы. “Крыклівая рэвалюцыйнасць” – характэрная рыса творчасці Сузона Ягуплы. Былы земскі аграном, крамнік, вулічны скрыпач, а потым журналіст і паэт, ён паказаны сатырычнымі фарбамі. Ён непрывабны знешне, не мае цвёрдых маральных правіл і самапавагі. Ягупла ўслаўляе ў вершах перамены, а ў прыватных размовах асуджае савецкую рэчаіснасць, пафасна заяўляе Галынскаму: “*Калі паэты не скажуць праўды пра свой час, гісторыя жорстка адпомсціць ім. Наступнае пакаленне абзаве іх хлусамі і баязліўцамі*” [6, с. 360], – і ў той самы час у прысутнасці Будніка ліслівa ўхваляе размах сацыялістычнага будаўніцтва, з якога іранізаваў у размовах з Галынскім. Адзнакі ж са-

праўднай паэзіі і журналістыкі, у трактоўцы пісьменніка, – праўдзівасць і шчырасць. Раман “Праз гады” – твор аптымістычны: жыццё там няўхільна змяняецца ў лепшы бок, станоўчыя героі рашуча пераадольваюць неспрыяльныя абставіны і ўпэўнена крочаць у будучыню. Ён напісаны пад моцным уплывам эстэтыкі сацрэалізму, як і аповесці з хранікальнай кампазіцыяй “Носьбіты нянавісці” і “Яны не пройдуць!” пра барацьбу партызан і падпольшчыкаў у час грамадзянскай вайны, дзе рэчаіснасць падаецца ў рэвалюцыйным развіцці і паэтызуюцца людзі, гатовыя ахвяраваць сабой у імя перамогі над ворагамі.

Аксіялагічны дыяпазон прозы Платона Галавача вызначаецца яе канцэптуальным узроўнем і паэтыкай. Прадметам мастацкага асэнсавання пісьменніка была сучаснасць, яго творы – адмысловае люстэрка паўсядзённасці, грамадскага жыцця першай трэці XX ст. з відавочным супрацьстаяннем старога і новага. Літаратурная спадчына П. Галавача сведчыць, што субстанцыяльнай асновай светабачання пісьменніка быў гістарычны аптымізм, вера ў лепшую будучыню, эстэтычным ідэалам – чалавек, які насуперак абставінам імкнецца змяніць свет у лепшы бок, а этычнай дамінантай творчасці – акцэнтаванне неабходнасці сацыяльнай справядлівасці, даверу і павагі да чалавека. Паэтыка прозы пісьменніка цікавая менавіта тым, што яна ўгрунтавана на даследаванні ўзаемадзеяння характараў і абставін, змены каштоўнасных прыярытэтаў пад уплывам часу, на драматызме сюжэтных сітуацый, якія перадавалі сацыяльна-гістарычную атмасферу першай трэці XX ст. праз няпростыя чалавечыя лёсы.

### Спіс літаратуры

1. **Галавач, П.** Збор твораў : у 3 т. / П. Галавач. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1958. – Т. 1 : Апавяданні. Нарысы. Артыкулы. – 1958. – 394 с.

2. **Галавач, П.** Дробязі жыцця : апавяданні / П. Галавач. – Мінск : Белдзяржвыд, 1927. – 176 с.

3. **Брыль, Я.** Збор твораў : у 10 т. / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2020. – Т. 6 : Лірычныя запісы і мініяцюры. 1945–1992. – 799 с.

4. **Гарэцкі, М.** Творы / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 629 с.

5. **Галавач, П.** Збор твораў : у 3 т. / П. Галавач. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1958. – Т. 2 : Аповесці. – 1958. – 406 с.

6. **Галавач, П.** Праз гады : раман / П. Галавач. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 368 с.